**Лаўрэаты прэмій імя акадэміка А.В.Лыкава 2012 года**

Пастановай Прэзідыума НАН Беларусі “Аб прысуджэнні прэмій імя акадэміка А.В.Лыкава 2012 года” ад 31 жніўня 2012 г. № 47

міжнародная прэмія імя акадэміка А.В.Лыкава 2012 года прысуджана за цыкл работ **“Энерга- і рэсурсазберажэнне ў працэсах сушкі: тэорыя і практыка”** аўтарскаму калектыву ў складзе:

**Кудра Тадэвуш** - старшы навуковы супрацоўнік фірмы “КЭНМЕТЭНЕРДЖЫ. Прыродныя рэсурсы” (Канада), ад’юнкт-прафесар у чатырох канадскіх універсітэтах, доктар філасофіі;

**Рудабашта Станіслаў Паўлавіч** - загадчык кафедры “Цеплатэхніка і энергазабеспячэнне прадпрыемстваў” Федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай адукацыйнай установы ВПО “Маскоўскі дзяржаўны аграінжынерны ўніверсітэт імя В.П.Гарачкіна”, доктар тэхнічных навук, прафесар;

**Снежкін Юрый Фёдаравіч** - намеснік дырэктара Інстытута тэхнічнай цеплафізікі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Украіны, доктар тэхнічных навук, прафесар.

Прэмія імя акадэміка А.В.Лыкава айчынным вучоным 2012 года прысуджана за цыкл работ “**Тэарэтычныя і эксперыментальныя даследаванні радыяцыйна-газадынамічных працэсаў пры імпульсным уздзеянні на рэчыва**” аўтарскаму калектыву ў складзе:

**Пенязькоў Алег Глебавіч** - дырэктар дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук;

**Раманаў Генадзій Сцяпанавіч** - вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”, кандыдат фізіка-матэматычных навук;

**Мінковіч Уладзімір** - прафесар Ілінойскага ўніверсітэта, г. Чыкага - галоўны рэдактар міжнароднага часопіса “Цяпло і масаперанос” (рэгіянальная рэдакцыя часопіса краін Усходняй Еўропы знаходзіцца ў дзяржаўнай навуковай установе “Інстытут цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”).